ные информаторы во всех структурах территориальной единицы позволят редакции формировать полную картину происходящего в регионе. Огромный поток информации в редакции поступает вместе с письмами читателей. В каждом письме, будь то обращение читателя в редакцию с просьбой о помощи или словами благодарности, присутствует определенный информационный повод. Дело журналиста – умело и вовремя его «раскрутить».

Еще со второй половины 1950-х годов пользовались популярностью внештатные отделы. Корреспондентские пункты из общественников возникают там, где нет штатных собкоров. Особенно полезным такое обогащение редакционной структуры оказалось там, где журналистский штат мал, а освещать широкий круг вопросов необходимо.

Проведенный анализ, таким образом, позволяет заключить, что региональная информация (информация, относящаяся к конкретной территориальной единице) необходима определенному региону для его оптимального развития, консолидации жителей как социальной, территориальной, исторической, этнической, религиозной общности. При знакомстве с информацией из другого региона появляется интерес к нему, что способствует развитию экономических, туристических, культурных и других отношений. Кроме того, представляя на страницах газеты все регионы, тем самым СМИ обеспечивает законодательное право граждан на получение разносторонней информации.

## РЫТОРЫКА ПРОПАВЕДЗІ (ПАРАЎНАЛЬНЫ АНАЛІЗ ПРАМОЎ ПРАВАСЛАЎНАГА СВЯШЧЭННІКА,КАТАЛІЦКАГА СВЯТАРА І ПРАТЭСТАНЦКАГА ПАСТЫРА)

**Т. М. Няхай**

Данесці Слова Боскае да вернікаў дапамагае гамілетыка – навука пра мастацтва пропаведзі. Пропаведзь не ёсць вольнай прамовай, гутаркай. Яна мае быць падрыхтаванай, заснаванай на пэўных законах, правілах. Іншая справа, як зазначае прафесар А. Міхальская, што правілы пабудовы пропаведзі ведаюць святары і тыя ж правілы застаюцца закрытымі для вернікаў. Аудыторыя не ўяўляе, як павінна выглядаць пропаведзь з рытарычнага гледжання.

Абапіраючыся на канцэпцыю бінарных апазіцый рытарычнага ідэалу, можна зрабіць параўнальны аналіз беларускамоўных пропаведзей праваслаўнага і каталіцкага святароў, а таксама пратэстанцкага пастыра.

Прадстаўнікі кожнага з вышэйназваных веравызнанняў арыентуюцца на рытарычныя ідэалы розных культур. Рытарычны ідэал айчыннай

праваслаўнай традыцыі ўсходнеславянскі ці царкоўнаславянскі. Свяшчэннік упэўнены ў значнасці сваёй справы, у непарушнасці царквы і словаў Боскіх, якія ён стараецца данесці да вернікаў. Адсюль і вобраз праваслаўнага прамоўцы: упэўненага ў сабе, спакойнага, ураўнаважанага, без лішніх рэзкіх рухаў, натуральнага і дарэчнага ў жэстах, матываванага, строгага і суцяшальнага ў міміцы. Адсюль і пачуццё братэрства, сабornасці, брацка-настаўніцкі зварот да вернікаў, што прыйшлі ў царкву: «Браты і сестры!». Праваслаўны святар не падзяляе сваю паству на вернікаў і нявернікаў. Ён бачыць чалавека роўнага сабе: актыўнага суб’екта, які здольны адчуваць, здольны прымаць рашэнні, усведамляць вынікі сваіх дзеянняў. Гэта і ёсць суб’ект-суб’ектная форма адносінаў. Дыялагічная па змесце, сіметрычная. Успрыманне навакольных людзей як братоў – прымета сацыяльна абумоўленая і культураспецыфічная, і ідзе яна ад праваслаўнай традыцыі, царкоўнаславянскай у прыватнасці. Характэрнай для прамовы святара з’яўляецца катэгорыя «мы». «Мы» – гэта не адзінкі, не кроплі, гэта зліццё чалавечых існасцяў, якое не прыніжае «самабытнасць» кожнага індывіда. Яно семантычна распадаецца не на «я» плюс «ты» плюс «ты» плюс «ты» (…), лучыцца ў «я» плюс «я» плюс «я» (…). І гэта не ёсць перашкода для ўсведамлення кожным аўтарытэту Богава намесніка. Нябесная і зямная іерархіі ёсць непарушнымі, натуральнымі і бессумнеўнымі. Іерархія не перашкаджае братэрству. Таму праваслаўны бацюшка беражліва ставіцца да моўных норм. Нават у беларускім маўленні ён ужывае царкоўнаславянізмы: *Свяшчэннае Пісанне* замест *Святое Пісьмо*, *Завет* замест *Запавет*, *Благавесце* замест *Дабравесце*.

Праваслаўны святар ужывае неадназначныя, часам алегарычныя фармулёўкі з Біблii, што ўказвае верніку на немагчымасць поўнага разумовага пазнання горняга свету, аднак дае магчымасць ўсведамлення яго сутнасці на ўзроўні ўнутранага, духоўнага: *«У ім (Слове) было жыццё, жыццё было святлом для чалавекаў. Ён (Ян) прыйшоў дзеля сведчання, каб сведчыў пра Святло. Ён не быў святлом, але быў пасланы, каб сведчыў пра Святло. І Слова сталася целам і асялілася між нас»*. Па форме прамова свяшчэнніка маналагічная – гэта слова аднаго, звернутае да шматлікіх, слова духоўнага бацькі, звернутае да дзяцей. Аднак у ім змест перакрывае форму, робячы апошнюю дыялагічнай, накіраванай на пошук ісціны і гармоніі.

Пратэстанцкі пастыр арыентуецца на заходні, у прыватнасці сафістычны рытарычны ідэал. Ён падзяляе аўдыторыю на некалькі груп: тых, хто верыць даўно, тых, хто звярнуўся да веры нядаўна, і нявернікаў,

варвараў. Пастыр павінен выканаць місіянерскую задачу: звярнуць людзей да веры, запоўніць tabula rasa – чысты ліст. Як прыклад прывядзём выхаваўчую пропаведзь, дзе гутарка ідзе пра дзяцей, моладзь, адносіны «бацькі – дзеці», а таксама павучальную, дзе пастыр адказвае на пытанне «Калі Бога патрэбна праслаўляць, ці значыць гэта, што ён славалюбны?»

На першай пропаведзі пастыр уздымае сацыяльную праблему, якую ён стараецца суаднесці з праблемай веры. Ён не хавае асабістага стаўлення да яе, даводзіць сваё меркаванне. Стараецца наладзіць зрокавы кантакт з аўдыторыяй, аглядае ўсю залу, звяртаецца да ўсіх і кожнага. Аднак жэстыкуляцыя яго бывае даволі рэзкай, нематыванай. З часам нарастае эмацыйнасць прамовы. Гэтаму спрыяе і выкарыстанне градацый: *«Я вас прашу, заклікаю, патрабую, нарэшце»*.

Пастыр узвышаецца над аўдыторыяй, аднак толькі фактычна. На практыцы ён здаецца звычайным чалавекам, у якога ўзнікла пэўнае меркаванне, і ён хоча распавесці пра свае назіранні, разважанні людзям. Часам пастыр спускаецца ў залу. Але ў запале становіцца да людзей ці бокам, ці паварочваецца спінай. Практыка, а таксама даследаванне пратэстанцкага погляду на гамілетыку пацвярджаюць, што па змесце пропаведзь пратэстанцкага святара з'яўляецца суб'ектна-абектнай. Адносіны пастыра да аўдыторыі можна назваць вольнымі, недзе панібрацкімі. Беларускамоўны святар тлумачыць цяжкія з яго гледжання словы для ўспрымання. Аднак яго ўласнае маўленне далёка не ёсць бездакорным як з лексічнага, так і з граматычнага гледжання. Як і праваслаўны святар, ён ужывае займеннік «мы», словы «браты і сёстры». Тут даволі характэрнай з'яўляецца рытарычная фігура эпіналепсіс – паўтарэнне слова ці групы слоў у адным сказе: *«Паслухайце, паслухайце, браты!»*. Аднак гэта толькі рытарычны прыём, які разлічаны на тое, каб выклікаць давер у людзей. Пастыр ужывае шмат зваротаў да аўдыторыі, рытарычных пытанняў. Прычым сам жа на іх і адказвае. «Што галоўнае? Запаветы і настаўленні? Не. Галоўнае, каб гэтыя запаветы ўкараніліся». Гэта так званая айтыялогія (выдумванне). Пастыр прыводзіць прыклады з уласнага жыцця. Так, разважаючы над пытаннем пра славу Боскую, ён узгадвае: *«Калі я быў маладым вернікам і чытаў Біблію, мяне здзіўляла быццам імкненне Бога да ўсведамлення людзьмі славы яго. Але з цягам часу я разважыў, што…”* ці *“Адна жанчына расказвала мне пра Боскія цуды ў сваім жыцці. Я вельмі дзівіўся. І спачатку нават не верыў. Але…»*. Пастыр ставіць пад сумнеў нейкія біблейскія ісціны, а потым сам жа даказвае іх правільнасць. Такім чынам, прамова пастыра хутчэй маналагічная па змесце і дыялагічная па форме.

Каталіцкі святар таксама арыентуецца на заходнюю прамоўніцкую традыцыю. Хутчэй польскую. Аднак у імкненні наблізіцца да верніка, касцёл даволі паспяхова ажыццяўляе сваю беларусізацыю.

Пропаведзі, так званыя казанні, ксёндз будуе на сюжэтах Святога Пісьма. Ён цытуе Біблію, тлумачыць яе пастве, ілюструе свае словы сюжэтамі з жыцця. Гаворыць святар спакойна, упэўнена і размерана. Як хрысціянская рэлігія не баіцца, што нехта будзе яе даследаваць, але наадварот, заахвочвае да гэтага, так і ксёндз не імкнецца пераканаць людзей у праўдзівасці сваіх слоў. Яму не ўласцівы няўпэўненасць, сумнеў. Біблія для яго ёсць ісціна. Ён ведае, што сумнявацца ў боскіх словах уласціва людзям. Але павярнуць людзей да царквы ён можа толькі сілай слова Боскага, тлумачэннем яго і сілай малітвы. Ксёндз не цісне сваім аўтарытэтам. Ён, як і праваслаўны святар, звяртаецца да *«братоў і сясцёр у Хрысце»*, *«шаноўных у Хрысце»*. І братэрства людзей замацоўваюць пэўныя рытуальныя дзеянні: разам устаць, разам пераржагнацца, разам стаць на калені, разам заспяваць песню. Казанне каталіцкага святара суб’ектна-суб’ектнае па змесце. Казанне маналагічнае па форме, звернутае да усіх і да кожнага.

З рытарычных фігур ужываецца сімплока (счапленне) – паўтарэнне таго ж пачатковага слова і таго ж апошняга: *«Хто сее скупа, той скупа і пажне; а хто сее шчодра, той шчодра і пажне»*.

Узнікае пытанне: ці дасягаюць прадстаўнікі трох веравызнанняў рапорту з аудыторыяй? Улічыўшы культураспецыфічнасць кожнага веравызнання, адзначым, што яны арыентуюцца на сваю аўдыторыю. Прамова праваслаўнага святара скіравана на стварэнне атмасферы святасці, узнёсласці, магутнасці, строгасці і ў той жа момант уседаравальнасці царквы. У момант пропаведзі людзі могуць рухацца па царкве, падыходзіць да ікон, звяртацца да святых са сваімі просьбамі, падзякамі, узносіць малітвы да Бога. Прамова пратэстанцкага пастыра скіравана на далучэнне людзей да царквы, перакананне іх, разважанне. Чалавеку іншага веравызнання яна можа здацца даволі свецкай, няпэўнай, занадта эмацыйнай. Адсутнічае характэрная для праваслаўных і каталікоў святасць, бессумнеўная вера. Часам яна нагадвае навукова-папулярнае разважанне, разбор спрэчных пытанняў жыцця і Евангелля. Аднак адзначым пэўную непадрыхтаванасць і залішнюю эмацыйнасць пратэстанцкага святара. Каталіцкі ксёндз карыстаецца аўтарытэтам у паствы. Святасць касцёла распаўсюджваецца і на святасць ксяндза ва ўяўленні вернікаў. Яго размераны голас і ўпэўненая постаць даюць спакой і веру. Відавочна, што кожны са святароў імкнецца да дасягнення рапорту і мае станоўчыя вынікі. Сапраўдны вернік ідзе не паслухаць

пэўнага святара, ён ідзе ў царкву, дзе можа наблізіцца да Бога. Аднак натуральна і тое, што некаторыя святары, не ўлічваючы правіл пабудовы сваіх пропаведзяў, вынікуюць наведванне людзьмі набажэнстваў.

Рытарычны ідэал трох Богавых памазнікаў падобны ў камунікатыўных мэтах, ілакутыўны працэс у іх аналагізуецца, але толькі перлакутыўны вынік (эфект) у іх розны, што прама прапарцыянальна залежыць ад гістарычнай зменлівасці, сацыяльнай абумоўленасці і культураспецыфічнасці таго рытарычнага ідэалу, які кожны з прапаведнікаў рэалізуе.

## «ПРОПАВШИХ БЕЗ ВЕСТИ – НЕТ!»

**А. Г. Петроченко**

В этом году белорусский народ отпраздновал 63-ю годовщину Победы над фашизмом. В музее истории БГУ собраны материалы о тех, кто в годы войны не склонил голову перед врагом. Среди тех, чьи имена золотыми буквами навечно вписаны в историю университета, – имя Георгия Захаровича Бегуна, бывшего старшего преподавателя кафедры теории и практики советской журналистики факультета журналистики Белгосуниверситета. Фляга, котелок, шлем, фотоаппарат «Фотокор-1» – эти личные вещи могли бы многое рассказать об их хозяине. В личном деле Георгия Захаровича есть сведения, что в годы Великой Отечественной войны он был разведчиком, почти три года находился в тылу врага. Самое невероятное, что он совершил побег из лагеря смерти «Тростенец».

Жизнь Георгия Захаровича Бегуна – это годы борьбы, подвига и творчества. Он родился 27 ноября 1922 года в деревне Пережир Пуховичского района Минской области. Из автобиографии узнаем, что его отец, 1870 года рождения, принимал участие в крестьянских бунтах революции 1905–1907 гг., а накануне Первой мировой войны эмигрировал за границу. Он работал по найму в Канаде, США и Аргентине. После Октябрьской революции вернулся на родину, получил надел земли и занимался сельским хозяйством. Был убит кулаками. Мать одна воспитала четверых детей.

Георгий Захарович поступил в Пережирскую народную среднюю школу в 1930 году, где проучился семь лет. В 1938 году юноша стал студентом Минского архитектурно-строительного техникума, но к началу войны успел окончить только три курса. В первые месяцы войны был в подполье, а с февраля 1942 года до середины июля 1944 г. руководил группой разведчиков специальной партизанской бригады им. Калинина от Разведуправления 1-го Белорусского фронта. Война не раз испытывала этого человека на прочность: около тысячи дней Георгий Захарович